# ДА *80*-ГОДДЗЯ

# МАРЫІ СІЛАНЦЬЕЎНЫ ШАЎЧОНАК



**Дарагая Марыя Сіланцьеўна!**

У Вас за плячыма доўгае, няпростае жыццё. Можна сказаць, што Вы цалкам прысвяцілі яго мастацтву слова. І Ваша праца на абласным тэлебачанні, і выданне літаратурнага альманаха «Нябесны знак», Вашы шматлікія вучні, Вашы выступленні, публікацыі, творы, песні на Вашы словы – дастойны ўклад у духоўнае развіццё нашага грамадства і нашай нацыянальнай культуры. Створаны Вамі вобраз лірычнай гераіні натхніў многіх сучасных беларускіх паэтэс, з'яўляецца ў пэўным сэнсе падставай для роздумаў, люстэркам для многіх з нас. Дарагая Марыя Сіланцьеўна, з нагоды Вашага 80-годдзя жадаем Вам моцнага здароўя, душэўных сіл і гармоніі з навакольным светам. Няхай вясновае цяпло майскага сонейка заўсёды сагравае Вашу душу. Так, за плячыма доўгае, няпростае жыццё. Але самае галоўнае, што яно працягваецца. **З ЮБІЛЕЕМ !**

**Калектыў**
**Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**

11 мая 2024 года

